**Дзяржаўная ўстанова**
**«Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»**
**Гарадская бібліятэка-філіял №2**



# *Казкі кніжнай феі: творы беларускай пісьменніцы Кацярыны Станіславаўны Хадасевіч-Лісавой*

**Слуцк, 2026**

**Дзяржаўная ўстанова
«Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»
Гарадская бібліятэка-філіял №2**

# *Казкі кніжнай феі: творы беларускай пісьменніцы Кацярыны Станіславаўны Хадасевіч-Лісавой*

**Рэкамендацыйны спіс літаратуры**

**Слуцк, 2026**

# Настаўніца і пісьменніца па сумяшчальніцтве



Беларуская сучасная пісьменніца, празаік і педагог Кацярына Хадасевіч-Лісавая нарадзілася 24 красавіка 1979 года ў мястэчку Ждановічы (Мінскі раён, Рэспубліка Беларусь). З красавіка 2006 года з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Уваходзіць у склад бюро секцыі дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі. Член рэдкалегій часопісаў «Вясёлка» і «Маладосць». Працуе ў галіне дзіцячай літаратуры, гэта асноўны напрамак творчасці аўтара, але ёсць творы і для дарослых. Літаратурны дэбют адбыўся ў 1996-м годзе на старонках часопіса «Першацвет». Першай публікацыяй стала аўтарскае паданне» Тырэй і Эйра", адрасаванае падлеткам. Большасць кніг для дзяцей-інтэрактыўныя. Пісьменніца прапануе не проста чытаць яе гісторыі, а яшчэ ўдзельнічаць у конкурсах, гуляць у гульні (якія ўключаны ў кнігі), праходзіць квэсты, спампоўваць размалёўкі і глядзець буктрэйлеры.

**Прапануем вашай увазе рэкамендацыйны спіс кніг Кацярыны Станіслаўны Хадасевіч-Лісавой, якія ёсць у фондзе гарадской бібліятэкі-філіяла №2. Кнігі ў спісе размешчаны ў алфавітным парадку, для кожнай кнігі ёсць анатацыя.**




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Станіславаўна. Вухуцік. Васільвася : фантаст. апавяданні: для сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; маст. В. Лемешава. – Мінск : Звязда, 2019. – 25, [3] с. : каляр. іл.**

«Ву-ху-у-у!». Менавіта так павітаўся б з вамі адзін з галоўных герояў кнігі пісьменніцы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Вухуцік і Васільвася – гэта фантастычныя істоты, якія трапілі на Зямлю з космасу праз сапраўдны магічны партал. Разумныя стварэнні хутка «асвоіліся» на нашай планеце: вывучылі беларускую мову, пакаштавалі маннай кашы і дранікаў са смятанкаю, паглядзелі, як у школе праходзяць урокі і пралятаюць перапынкі... Прыстасавацца да паўсядзённасці ім дапамагалі звычайныя “некасмічныя” дзяўчынка Улада і хлопчык Максім. Дарэчы, выданне незвычайнае, бо складаецца з дзвюх казачных частак: адна гісторыя напісана для дзяўчынак, другая – для хлопчыкаў, але ніхто не забараняе чытаць “чужую” казку. А яшчэ ў кнізе дзяцей чакае... вандрульня! Што гэта за “фрукт” такі і як з яго дапамогай весела п равесці час – адказ шукайце ў кнізе!




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Вухуцік і дзіва : фантаст. апавяданні : для малод. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [маст. В. Лемешава]. – Мінск : Звязда, 2024. – 132, [2] с. : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Канікулы, святы і цудоўны сюрпрыз: да дзяўчынкі Улады прыляцеў яе іншапланетны сябар Вухуцік! Адразу пачынаюцца цікавыя падзеі, неверагодныя здарэнні і вясёлыя прыгоды, але Улада заўважае, што хлопчыка нешта сур'ёзна турбуе. Ён трымае сваю праблему ў таямніцы і не скардзіцца, бо не хоча псаваць святочны настрой. Пакуль сітуацыя не вымушае яго...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Вухуцік і яго таямніцы : казачная аповесць: для малод. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [маст. В. Лапіна]. – Мінск : Звязда, 2022. – 125, [3] с. : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Дзяўчынка Улада з Зямлі і хлопчык Вухуцік з далёкай таямнічай планеты Вухуціі сустрэліся і пасябравалі. А для сапраўднага сяброўства, як вядома, не існуе адлегласцей і перашкод. Дзеці разам падарожнічалі па космасе, тэлепартаваліся адно да аднаго ў госці, весяліліся, знаёміліся з жыццём на новых для іх планетах, траплялі ў розныя цікавыя сітуацыі. І вось аднойчы зусім выпадкова адкрылі таямніцу, якая перайначыла жыццё Вухуціка і задала яму складаную загадку. У захапляльнай казачнай гісторыі сябры разам паспрабуюць знайсці адказ на яе. Яны пераканаюцца, што сустрэліся і пасябравалі зусім невыпадкова, таму што...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Вухуцік. Міжпланетны ваяж : казачная кніга-тэлепорт : для малод. і сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Іна Марозава. – Мінск : Звязда, 2025. – 52, [3] с. : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Тэлепорт існуе! Гэта кніга Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Вухуцік. Міжпланетны ваяж»! Адпраўляйцеся ў міжпланетнае падарожжа, сябры! Вас чакае цудоўная касмічная вандроўка і фантастычна-прыгодніцкая гісторыя пра дзяўчынку з Зямлі і іншапланетніка з таямнічай Вухуціі. Вы здзейсніце палёт на далёкую планету! Якая яна? Хто там жыве? Што адбываецца? Цікавае ці небяспечнае падарожжа атрымаецца ў галоўнай гераіні ічытачоў кнігі, якія разам тэлепартуюцца на загадкавую планету?




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Год прыгод лісічкі Красуні : для малод. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Дзіяна Бецун. – Мінск : Звязда, 2025. – 179, [3] с. : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Абаяльная і вясёлая лісачка Красуня заўсёды ў цэнтры падзей. Прыгоды знаходзяць няўрымслівую фантазёрку ці яна іх – невядома, але сумаваць лісачцы і яе сябрам ніколі не даводзіцца. У Дзівосным лесе адбываюцца цікавыя, неверагодныя здарэнні і нават страшныя гісторыі… Герояў чакае карагод прыгод ва ўсе поры года. Далучайцеся і вы, дарагія сябры!




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Загадка прынцэсы Агнэсы : шахматныя казкі : для малод. і сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак А. Балыш]. – Мінск : Звязда, 2021. – 60, [2] с. : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

У гэтай кнізе жывуць прыўкрасныя прынцэсы, багатыя каралі і кемлівыя ды разумныя людзі з народу. Тры казкі і іх персанажаў аб'ядноўвае старажытная забава, якую называюць мастацтвам, навукай і гульнёй. Гэта шахматы! Яны паспрыялі героям кнігі развеяць злыя чары, здабыць жаданае шчасце і знайсці сапраўднае каханне!




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Знаёмцеся – #Падабайка.к@! : [казка для малод. і сярэд. шк. узросту] / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак В. Лапіна]. – Мінск : Звязда, 2020. – 45, [3] с. : іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Вы хацелі б мець унікальны гаджэт, які ніколі не патрабуе зарадкі, абсалютна не расходуе трафік, не псуе зрок, не "глючыць". А яшчэ ён дае карысную інфармацыю, вядзе ў свет фантазіі, пашырае слоўнікавы запас, дорыць магчымасць знаёміцца ў Сусветным сеціве з новымі сябрамі, гуляць у настольную гульню і вясёлую вандрульню з прызам для самых уважлівых і актыўных карыстальнікаў адной з сацыяльных сетак...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Касмічная адысея хлопчыка Стасіка : для сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак В. Дударэнка. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. – 127 с. : іл.**

У сне, як вядома, можна пабываць дзе заўгодна і пабачыць самае незвычайнае. Галоўны герой кнігі хлопчык Стасік кожную ноч пераносіцца ў дзівосную Краіну Сноў, дзе знаёміцца з казачным хлопчыкам Зорнічкам. Дзеці разам падарожнічаюць па загадкавым мікракосмасе, іх заўсёды чакаюць цікавыя прыгоды. Разам са Стасікам і Зорнічкам маленькія чытачы здзейсняць дзівосныя падарожжы ў Зніч-гарадок і Аблокавую краіну. На старонках гэтай кнігі дзеці сустрэнуцца з зоркамі-красунямі, даведаюцца пра важную справу знічак і пазнаёмяцца з Феяй, якая адкрые таямніцу прыгатавання эліксіру казачных сноў. А самыя адважныя чытачы дапамогуць героям адшукаць зладзейку Чорную Дзірку і выратаваць тых, хто трапіў у яе палон…




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Казкі сівой даўніны : для малод. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак А. Балыш]. – Мінск : Звязда, 2022. – 36, [3] с. : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі). – Змест : Вадзіца з крыніцы ; Вілія ; Як з’явіліся самыя прыгожыя азёры.**

Таямнічае заўсёды існавала і існуе побач з намі. У загадкавых істот верылі продкі, не сумняваліся і ў тым, што некаторыя людзі валодаюць незвычайнымі здольнасцямі. Пра гэта – казкі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Калі ў вас жыве дух авантурызму, то гэтыя творы абавязкова прыйдуцца вам даспадобы.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Канікулы з прагодамі, альбо Зваротны візіт Зорнічка да хлопчыка Стасікакніга: казачная аповесць : для сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак А. Карповіч. – Мінск : Звязда, 2016. – 181с. : каляр. іл.**

Кніга распавядае пра тое, як госць з космасу знаёміўся з жыццём на Зямлі, пра цікавыя прыгоды сяброў на канікулах. Сюжэт спалучае рэальных і казачных персанажаў, з якімі адбываюцца як рэальныя, так і казачныя падзеі. Гэта, напрыклад, велапрабег, падчас якога дзеці заблукалі, але агульнымі намаганнямі здолелі самастойна знайсці дарогу дадому, і сапраўдная дэтэктыўная гісторыя, якая здарылася пасля. Разам з героямі чытачы апынуцца і ў космасе – якраз у той момант, калі ім пагражае сур’ёзная небяспека. Кніга здольная захапіць юных чытачоў. А паводзіны і ўчынкі яе герояў вучаць дзяцей быць добрымі, шчырымі, спагадлівымі, ветлівымі, цаніць сяброўства і разумець агульначалавечыя каштоўнасці.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Ключ ад вялікай каштоўнасці: кніга-квэст: [для сярэд. шк. узросту] / Кацярына Хадасевіч-Лісавая. – Мінск : Звязда, 2020. – 181с. [2] с:. іл**

У гэтай кнізе жывуць міфалагічныя персанажы, знаёмыя нам з фальклору. Кажуць, некалі даўно яны існавалі, і нашы продкі часам бачылі іх на свае вочы. Старонкі гэтага выдання не толькі пакажуць міфічных істот, але і адкрыюць іх таямніцы. Твор уваходзіць у вучэбную праграму па беларускай літаратуры для 6 класа.




**Хадасевіч-Лісавая К. С. Код геніяльнасці : казачная аповесць : аповесць : для сярэд. і ст. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Іна Марозава. – Мінск : Беларусь, 2025. – 78, [1] с. : іл.**

Кніга адрасавана падлеткам і моладзі. Чытачы пазнаёмяцца з новымі героямі, сваімі аднагодкамі, якія, на першы погляд, нічым адметным не вылучаюцца. Такіх дзяўчат і юнакоў вакол шмат, але старонкі твора распавядуць пра іх жыццёвыя перыпетыі — каханне і здраду, сяброўства і суперніцтва, дабрыню і жорсткасць. Захапляльнасці сюжэту надаюць містычныя падзеі, якія адбываюцца з героямі…




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Лета на зачарованым балоце : раман - казка : [для сярэд. і ст. шк. узросту] / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак Г. Іванова]. – Мінск : Звязда, 2024. – 197, [2] с. : іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Андрэй і Юля – звычайныя сталічныя падлеткі, якія вельмі чакаюць лета, каб правесці канікулы ў весцы. Але ж не толькі вабіць дзяцей сустрэча з бабуляй і дзядулем, яны імкнуцца на Зачараваннае балота, якое мае дзівосную таямніцу… Падлеткі апыняюцца ў віры містычных падзей, з жыхарамі загадкавай мясціны. Што там закруцілася, прадсказаць не мог ніхто…




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Лісічка красуня і сапраўдны герой : казка : [для малод. шк. узросту] / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Дзіяна Бецун. – Мінск : Звязда, 2024. – 46, [1] с. :. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Абаяльная і вясёлая лісачка Красуня проста прыцягвае да сябе розныя прыгоды! У гэтай гісторыі разам з прыгодамі прыцягнууўся сусветна вядомы вандроўнік, адважны падарожнік, галантны кавалер па імені Лухташ. Сваю ўвагу ён дзеліць між трыма сяброўкамі: асыпае лясных паненак кампліментамі, прысвячае песні і дорыць незвычайны падарунак. І ўсё цудоўна і прыгожа, але...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Новыя прыгоды лісічкі красуні Лісічка : казачная аповесць : [для малод. шк. узросту] / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Дзіяна Бецун. – Мінск : Звязда, 2023. – 179, [3] с. :. каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Галоўная гераіня кнігі – вясёлая і цікаўная лісачка Красуня. Раней яна жыла ў мегаполісе, а потым малечы пашанцавала вырвацца з тлуму вялікага горада і пасяліцца ў Дзівосным лесе, дзе яе выхавацелем стаў вялікі, моцны і добры мядзведзь Буры. Красуня знайшла сярод лясной дзятвы шмат сяброў, якім з гэтай мілай фантазёркай сумаваць ніколі не даводзіцца! Пра вясёлыя прыгоды, цікавыя забавы, неверагодныя здарэнні і дэтэктыўныя гісторыі і раскажа гэта кніга. Лісачка запрашае чытачоў у Дзівосны лес! Уваход – пад вокладкай!




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Знаёмцеся –Падабайка.к – гэта я ! : кніга-гаджэт : для малод. і сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак В. Лапіна. – Мінск : Беларусь, 2025. – 52, [3] с. : каляр. іл. – (Гісторыі Кніжнай феі).**

Вы хацелі б мець унікальны гаджэт, які не патрабуе зарадкі, не расходуе трафік, не псуе зрок і не «глючыць»? А яшчэ пашырае веды, вядзе ў свет фантазіі, дапамагае знайсці сяброў у Сеціве, дае магчымасць пагуляць у настольную гульню і вясёлую вандрульню з прызам для самых уважлівых карыстальнікаў сацыяльных сетак? Гэты гаджэт у вас у руках – гэта кніга, у якой Кніжная Фея спалучыла экран смартфона і папяровыя старонкі! У ёй вы пазнаёміцеся з сімпатычным віртуальным героем – Падабайкам, якога ведае ўвесь свет...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Падарожжы ў Чароўны лес : казачная аповесць : для малод. і сярэд. шк. узросту / К. С. Хадасевіч-Лісавая ; мастак В. Дударанка. – Мінск : Мастацкая. літаратура, 2008. – 63 с. : іл. – (Казкі XXI ст.).**

Старонкі гэтага выдання запрашаюць маленькіх чытачоў у дзівосныя вандроўкі па Чароўным лесе. Кожнае падарожжа – сустрэча з новымі казачнымі персанажамі, якія стануць для дзяцей сапраўднымі сябрамі. Разам з імі дзеці будуць спасцігаць вечныя каштоўнасці сяброўства, узаемадапамогі, дабрыні і міласэрнасці.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Падарунак караля: казка : для малод. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак Іна Марозава]. – Мінск : Звязда, 2024. – 37, [2] с. : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Кароль зрабіў сваю дзяржаву самай магутнай і багатай. Справамі каралеўства ён жыў многія дзесяцігоддзі, а сям'і не займеў. І калі падабралася пара перадаць трон надзейнаму, разумнаму, шчыраму і добраму пераемніку, стала зразумела, што знайсці такога зусім няпроста...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Палет над Вухуцію : фантаст. казка : для малод. і сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак В. Лапіна]. – Мінск : Звязда, 2021. – 38, [2] с. : іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Тэлепорт існуе! Гэта кніга адпраўляйцеся ў неверагоднае падарожжа, сябры! Вас чакае цудоўная касмічная вандроўка і фантастычна-прыгодніцкая гісторыя пра дзяўчынку з Зямлі і хлопчыка з

таямнічай Вухуціі. Вы здзейсніце палёт на далёкую планету! Якая яна? Хто там жыве? Што адбываецца? Цікавае ці небяспечнае падарожжа атрымаецца ў галоўнай гераіні і чытачоў кнігі, якія разам тэлепартуюцца на загадкавую планету?




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Прыгоды лісічкі Красуні : казачная аповесць : [для малод. шк. узросту] / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак В. А. Шпакоўская. – Мінск : Звязда, 2021. – 174, [1] с. :. каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Абаяльная і вясёлая гераіня казачнай аповесці лісачка Красуня перасялілася ў Дзівосны лес з мегаполіса. Яе гарадское мінулае мае таямніцу, якую яна не спяшаецца адкрываць... На новым месцы лісічка шукае і знаходзіць сяброў. Разам з абаяльнымі казачнымі героямі чытач перажыве захапляльныя прыгоды, нечаканыя падзеі, страшныя здарэнні і нават разблытае сапраўдную дэтэктыўную гісторыю.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С.. Ратавальнік : аповесці : для сярэд. і ст. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Іна Марозава, Вера Капцова. – Мінск : Беларусь, 2026. – 189, [2] с. : іл. – (Нацыянальная літаратурная прэмія).**

Кніга адрасавана падлеткам і моладзі. Чытачы пазнаёмяцца з новымі героямі, сваімі аднагодкамі, якія, на першы погляд, нічым адметным не вылучаюцца. Такіх дзяўчат і юнакоў вакол шмат, але старонкі твора распавядуць пра іх жыццёвыя перыпетыі — каханне і здраду, сяброўства і саперніцтва, дабрыню і жорсткасць. Захапляльнасці сюжэту надаюць містычныя падзеі, якія адбываюцца з героямі.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Сакрэты аднаго каралеўства: казка : [для малод. і сярэд. шк. узросту] / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Іна Марозава. – Мінск : Беларусь, 2025. – 55 с. : каляр. іл. – (Гісторыі Кніжнай феі).**

Персанажы кнігі — не людзі, не жывёлы, не расліны. Гэта казачная гісторыя пра загадкавых істот, якія фарсяць у вытанчаных капелюшах, жывуць у сваім асобным каралеўстве і вірують у эпіцэнтры прыдворных падзей. Хто ж гэты высакародны, арыстакратычны, шляхетны народ? Завітайце ў таямнічае каралеўства, пазнаёмцеся з яго жыхарамі і даведайцеся, якія падзеі не на жарт узрушылі іх…




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Страшныя гісторыі для самых смелых: жахлівікі : для сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Дзіяна Бецун. – Мінск : Звязда, 2025. – 191, [1] с. :. каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Між старонак гэтай кнігі стаіліся таямнічыя персанажы, якія любяць сустракацца з чытачамі познім вечарам, калі самыя смелыя з іх адважваюцца пачытаць страшныя гісторыі пра прывід з хутара, Ліловага цмока альбо Змрочнага птаха. Містычныя персанажы запрашаюць у небяспечны шлях па чырвоных стрэлках, прымушаюць наведаць прыстанак зданяў, прапануюць пазнаёміцца з гасцямі з іншасвету. Чытайце, калі вы сапраўды бясстрашныя.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Таямніца зачараванага балота: казачная аповесць : для сярэд. шк. узросту / К. С. Хадасевіч-Лісавая ; мастак В. Дударанка. – Мінск : Мастацкая. літаратура, 2021. – 197, с. : [2] с. : каляр. іл.**

Дрыгва — небяспечнае месца для гульняў, але толькі не тады, калі тымаеш запрашэнне ад самога Багніка, гаспадара зачараванага балота, і першай лэдзі Кікімары. Вясёлая і адважная кампанія, у якую аб'ядналіся звычайныя дзеці Андрэй і Юля з іх незвычайнымі сябрамі Кімай, Марайі Балоцем, адкрые для чытачоў сакрэты зачараванага балота, зазірнеў самыя загадкавыя мясціны, запросіць у казачны свет і далучыць да незабыўных прыгод...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Таямніцы незвычайнай школы: казачная аповесць : для малод. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак А. Карповіч. – Мінск : Звязда, 2018. – 215 с. : каляр. іл.**

«Ну што асаблівага можа быць у школьным жыцці?» – скажаце вы. Настаўнікі, урокі, перапынкі, навучальны год, канікулы…Здавалася б, пра школу мы ведаем усё. А вось і не! Новая кніга Кацярыны Хадасевіч-Лісавой (якая, на хвілiначку, не толькі вядомая пісьменніца, але і настаўніца) распавядае пра той бок школьнага жыцця, аб існаванні якога ніхто нават не здагадваецца! Што адбываецца, калі ўсе дзеці і настаўнікі разыходзяцца па дамах? Якую таямніцу захоўваюць школьныя кабінеты і калідоры? Хто жыве ў адной, з выгляду самай звычайнай, школе? А магчыма, не толькі ў ёй... Калі хочаце пабачыць усё на свае вочы, паглыбляйцеся ў сюжэт, падключайце фантазію – і ўсё таемнае стане відавочным.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. У пошуках страчанага скарбу: кніга - квэст : для ст. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; мастак Галіна Іванова – Мінск : Беларусь, 2025. – 270, [1] с. : іл.**

Кніга-квэст запрашае ў цікавае падарожжа. Напачатку гісторыі кожны чытач выбірае сабе аватара, атрымлівае ў кампанію яшчэ аднаго спадарожніка, і яны разам адпраўляюцца збіраць артэфакты ў персанажаў, якія жывуць у таямнічым каралеўстве. Няпросты шлях, якім давядзецца ісці, будзе ў кожнага свой, бо кніга чытаецца не па парадку, а так, як вырашае чытач-герой. Будзьце гатовыя дапамагаць персанажам шукаць выйсце са складаных сітуацый і прымаць адказныя рашэнні. Падрыхтуйцеся наведаць Палац Багацця, Крэпасць Улады, Замак Славы і выстаяць супроць спакус, якія чакаюць у гэтых мясцінах.




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Ціхім вечарам: жахлівікі : аповесць : для сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак Дзіяна Бецун]. – Мінск : Звязда, 2025. – 48 с : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі).**

Гэта гісторыя адбылася са школьнікамі, якія не любілі чытаць і ўсімі шляхамі вынаходзілі спосаб напісаць сачыненне, не разгарнуўшы кнігу. Кажуць, непрачытаныя кнігі ўмеюць... помсціць. А тут з’явіўся яшчэ і сам загадкавы пісьменнік, які знарок сабраў гэтых вучняў у сваім доме на глухім хутары. Ціхі вечар стаўся страшнай рэальнай гісторыяй, у якой да палонных гасцей з’явіліся прывіды з аповесці пісьменніка, а сам ён...




**Хадасевіч-Лісавая, К. С. Па чырвоных стрэлках: жахлівікі : аповесць : для сярэд. шк. узросту / Кацярына Хадасевіч-Лісавая ; [мастак Дзіяна Бецун]. – Мінск : Звязда, 20253. – 37, [2] с : каляр. іл. – (Казкі Кніжнай феі)**.

Гэты жахлівік Кацярыны Хадасевіч-Лісавой — для самых смелых чытачоў, якія не пабаяцца скласці кампанію галоўнаму герою аповеда — хлапчуку Раману і разам з ім адправяцца праз гэту кнігу ў летнік, што размясціўся ў лесе каля вёскі Жахлівай. Важатым стане маладынастаўнік, ёнжа загадкавы Гаспадар Гісторыі, які ведае старажытныя страшныя легенды гэтых мясцін. Дый самі легенды і іх персанажы ажывуць пад святлом поўні, калі даверлівы Рома пойдзе па загадкавых чырвоных стрэлках, якія вядуць...



***Казкі кніжнай феі: творы беларускай пісьменніцы Кацярыны Станіславаўны Хадасевіч-Лісавой***

**Рэкамендацыйны спіс літаратуры**

Складальнік: Свірэпа Л. В.

223610 г. Слуцк. Дзяржаўная ўстанова
«Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»
Гарадская бібліятэка-філіял №2
Тэл. 3-23-42

e-mail: info@slucklib.by


Кацярына Хадасевіч-Лісавая
Сакрэты аднаго
каралеўства